— Совет Министров.
— Суд Союзного государства.
— Счетная палата.
— Должностные лица.
6. Акты Союзного государства.
7. Заключительные положения.

В ходе реализации положений Договора о создании Союзного государства планируется осуществить следующие мероприятия.

1. Выравнивание основных макроэкономических показателей и проведение единой структурной политики.

2. Унификация гражданского законодательства и определение основ создания собственности Союзного государства.

3. Введение единой денежной единицы.

4. Унификация налогового законодательства и проведение с 2001 г. единой налоговой политики.

5. Формирование и исполнение бюджета Союзного государства.

6. Проведение единой торговой и таможенно-тарифной политики в отношении третьих стран, международных организаций и объединений.

7. Формирование общего рынка ценных бумаг и создание учреждений по эмиссии ценных бумаг и регулированию фондового рынка.

8. Проведение единой политики в области ценообразования и механизм ее осуществления.

9. Объединение энергетической и транспортной систем и некоторые другие мероприятия.

Исходя из уставных документов, а также выгод и потерь Союзного государства можно сделать стратегический вывод. Интеграция в принципе выгодна, но программа реализации положений Договора весьма обширна, и потребуется достаточно много времени и существенные материальные затраты для ее осуществления.

***Я.М.Саўчыц,***
студэнтка БДЭУ (Мінск)

## Беларусь як фактар сусветной геапалітыкі

Беларусь сёння – гэта краіна з 207,6 тыс. км$^2$ тэрыторыі. Лічыцца, што гэта не малая плошча. Напрыклад, Англія мае 244,15 км$^2$, Югаславія – 155,8 км$^2$. Працяг з паўднёвага захаду на паўночны ўсход – 675 км., з поўначы на поўдзень – прыкладна столькі ж. Тут пражывае 10 млн 45 тыс. чалавек, што складае 3,6 % усяго насельніцтва былога СССР. Па колькасці жыхароў рэспубліка апярэджвае Аўстрыю, Швейцарыю, Нарвегію і шмат іншых краін.

За 9 гадоў пасля абвяшчэння суверэнітэту Рэспубліка Беларусь была прызнана больш чым 123 краінамі свету, з 97 устаноўлены дыпламатычныя адносіны. Яна з'яўляецца паўнапраўным членам звыш дваццаці міжнародных арганізацый, у дзесяці мае статус назіральніка. Беларусь па свайму аб'ектыўнаму геапалітычнаму і геастратэгічнаму становішчу можа адыгрываць ролю восевай дзяржавы, г. зн. можа аказваць палітычны, ваенны і эканамічны ўплыў на ўвесь рэгіён.

Перад усімі прадстаўнікамі разнастайных нацыянальнасцей, якія пражываюць на тэрыторыі Беларусі, задача заўсёды была адна – зберагчы і захаваць межы дзяржавы і аднавіць колькасць насельніцтва пасля чарговай бойкі суседзяў на зямлі беларускай.

Беларуская зямля, перажыўшы ў сваёй гісторыі бясконцую колькасць самых розных акупацый, якія ўсталёўвалі сваю ўладу, веру і культуру, на рубяжы XXI стагоддзя стала арэнай новага выпрабавання. Па сутнасці, разгарнулася неаб'яўленая геапалітычная вайна за Беларусь. Атрымаць ключы ад "беларускага калідора" знайшлося нямала ахвотнікаў. З канца 80-х гг. Захад разам з ЗША стаў актыўна ажыццяўляць дактрыну пашырэння сусветнага супольніцтва рыначных дэкларацый. Карані гэтай палітыкі глыбока ўваходзяць у эканамічныя інтарэсы заходніх краін.

Выбар пяў на дзяржавы сацлагера, якія у канцы 80-х гг. сутыкнуліся з вядомымі крызіснымі з'явамі. У 1989 г. першымі пайшлі па шляху так званай "заходняй дэмакратыі" краіны Усходняй Еўропы, а з 1991 г. працэс быў перанесены на глебу краін СССР. Сярод тых, хто вырашыў самастойна вызначыць свой лёс, была Беларусь.

Зразумела, што краіна, якая за многія стагоддзі эканамічнай пупавінай прырасла да Расіі, аб'ектыўна вымушана была шукаць шляхі эканамічнага і палітычнага супрацоўніцтва на Усходзе.

Рэчаіснасць патрабуе, каб сваё геапалітычнае становішча Беларусь упершыню за многія тысячагоддзі выкарыстала на карысць свайго народа.

Адносіны з сусветам павінны будавацца так, каб лёс нашай Айчыны не залежаў толькі ад знешніх сувязей, што характэрна для большасці краін у стадыі развіцця. Але Беларусь ні ў якім разе не павінна і замыкацца ў сабе. Пры сумленных раўнапраўных і партнёрскіх адносінах, апоры на навукова-эканамічны патэнцыял і багацейшы інтэлект нацыі Беларусь здольная зрабіць маланкавы прарыў як у эканамічным, так і ў палітычным плане. Прыклад — пасляваенная Японія, ФРГ і іншыя краіны.

Аднак марудласць, непаваротлівасць і раз'яднанасць славянскага свету прымушаюць усё яшчэ знаходзіцца далёка ад гэтай відавочнай высновы.



БДЭУ Беларускі дзяржаўны эканамічны ўніверсітэт. Бібліятэка.
БГЭУ Белорусский государственный экономический университет. Библиотека.
BSEU Belarus State Economic University. Library.
http://www.bseu.by elib@bseu.by